# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

## Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выконвалася ў межах прыярытэтных навуковых тэм «Сістэмна-структурныя асновы беларускай літаратурнай мовы» (2006 – 2010 гг., нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 2006258), «Сучасная беларуская літаратурная мова: нормы, дынаміка, функцыянаванне» (2011 – 2015 гг., нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20112203).

**Мэта і задачы даследавання** – пабудаваць кампенсаторную сінтаксічную тыпалогію канструкцый з эліпсісам дзеяслова ў сінтаксічнай сістэме сучаснай беларускай літаратурнай мовы. У адпаведнасці з мэтай даследавання ставіліся і вырашаліся наступныя **задачы**:

– распрацаваць тэарэтычныя асновы кампенсаторнай сінтаксічнай тыпалогіі;

– вылучыць структурныя тыпы канструкцый з эліпсісам дзеяслова, устанавіць ступень іх частотнасці;

– выявіць семантычныя тыпы, мадэлі, структурныя схемы канструкцый з эліпсісам дзеяслова з вызначэннем іх частотнасці і прадуктыўнасці;

– устанавіць спецыфіку спосабаў эксплікацыі прэдыкатыўных значэнняў у эліптычных сказах і ўмовы іх функцыянавання;

– ахарактарызаваць кампенсаторныя ўласцівасці парадыгмы структурна-сінтаксічных мадыфікацый у эліпсаваных адзінках;

– вылучыць і сістэматызаваць моўныя механізмы, што рэгулююць функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова.

**Аб’ектам** даследавання выступаюць эліптычныя канструкцыі ў сінтаксічнай сістэме сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

**Прадметам** дысертацыйнага даследавання з’яўляецца сістэма структурных, семантычных і функцыянальна-граматычных параметраў тыпалогіі канструкцый з эліпсісам дзеяслова.

**Матэрыялам** для даследавання паслужылі арыгінальныя творы мастацкай літаратуры XX–XXI стст., сучасныя публіцыстычныя і грамадска-палітычныя выданні. Фактычны матэрыял для аналізу падбіраўся шляхам суцэльнай выбаркі. Усяго ў дысертацыі прааналізаваны 620 крыніц, агульны аб’ём даследаванага матэрыялу – 22 574 сінтаксічныя канструкцыі.

Падбор ілюстрацыйнага матэрыялу не з’яўляецца выпадковым. Па-першае, мова беларускай мастацкай літаратуры – гэта асноўная функцыянальна-стылявая разнавіднасць літаратурнай мовы, дзе інтэграцыйна выкарыстоўваюцца элементы ўсіх стыляў і падстыляў. У ёй зафіксаваны не толькі найбольш устойлівыя традыцыйныя аспекты рэалізацыі моўнай сістэмы, замацаваныя ў працэсе камунікацыі, але і тыя змены, якія ў значнай ступені залежаць ад індывідуальных стыляў найбольш вядомых і аўтарытэтных аўтараў. Мова мастацкай літаратуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і публіцыстыкі поўнасцю акумулюе ў сабе стабільнасць, унармаванасць асобных катэгорый, а таксама пошукі новых форм выражэння думкі, наватарства, што значна ўплывае на дэмакратызацыю літаратурных норм. Па-другое, публіцыстычныя тэксты сваёй спецыфічнай сінтаксічнай экспрэсіўнасцю дазваляюць пераканацца ў стабільнасці літаратурных норм, а таксама даюць магчымасць прасачыць найбольш дакладныя формы падачы матэрыялу, сярод якіх сінтаксічныя адзінкі дынамічнага сінтаксісу (эліпсіс, сінтаксічная рэдукцыя і сінтаксічная кампрэсія, сінанімічныя сінтаксічныя пераўтварэнні, семантычная імплікацыя, парцэляцыя) займаюць асобае месца. Такім чынам, можна канстатаваць, што ў мове твораў мастацкай літаратуры і публіцыстыкі XX–XXI стст. найбольш выразна адлюстроўваецца нарматыўнасць моўных фактаў, выяўляюцца дынамічныя працэсы ў сінтаксічнай сістэме літаратурнай мовы, яе эвалюцыя.

**Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Тыпалогія канструкцый з эліпсісам дзеяслова распрацавана з улікам кампенсаторнай прыкметы – новага паняцця, што характарызуе механізм замяшчэння ў іх структурна-семантычных і прэдыкатыўных значэнняў. Кампенсаторнай прыкмеце ўласцівы ўніверсальнасць – маштаб ахопу сінтаксічных з'яў; кваліфікацыйны характар – адсутнасць карэляцыйнай апазіцыі; інтэгральная функцыя – здольнасць аб'ядноўваць сінтаксічныя адзінкі ў класы на аснове спосабаў і сродкаў кампенсацыі сэнсу.

Кампенсаторная прыкмета ўключае кампаненты розных узроўняў: сінтаксічнага, семантычнага, марфалагічнага, лексічнага, фанетычнага. Функцыянальная прыналежнасць гэтых адзінак залежыць ад аб'екта маркіроўкі – семантыкі або прэдыкатыўных значэнняў эліпсаваных канструкцый. У залежнасці ад функцыянальнага дыяпазону кампенсаторныя кампаненты падзяляюцца на канстантныя (маркіруюць семантыку ў межах аднаго тыпу прэдыката), монафункцыянальныя (маркіруюць сумежную семантыку на аснове камбінаторных уласцівасцей) і поліфункцыянальныя (маркіруюць семантыку розных тыпаў прэдыкатаў). Сістэматызацыя тыпаў, відаў, падвідаў эліптычных канструкцый, іх кампенсаторных сродкаў у кантынуум ажыццяўляецца на аснове ступені праяўлення тыпалагічных уласцівасцей і іх суадноснай функцыянальнай тоеснасці.

2. Структурная тыпалогія канструкцый з эліпсісам дзеяслова, упершыню пабудаваная на аснове кампенсаторных уласцівасцей структурных кампанентаў, уключае 8 тыпаў: поліпрэдыкатыўны, звышфразавы з прэдыкатыўнымі сінтаксічнымі адзінкамі, звышфразавы з парцэляванымі сінтаксічнымі адзінкамі, ускладнена-паратаксічны, ускладнена-паўпрэдыкатыўны, ускладнена-параўнальны, ускладнена-інтрадуктыўны, ускладнена-далучальны.



РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

Тыпы прадстаўлены адпаведнымі відамі: *поліпрэдыкатыўны* – экспліцытна-паратаксічным, імпліцытна-паратаксічным, эксплiцытна-гіпатаксічным, імпліцытна-гіпатаксічным, камбінаваным; *звышфразавы* – з логіка-семантычнымі відавымі адносінамі тоеснасці, уключэння, перакрыжавання, з семантыка-сінтаксічнымі адносінамі далучальнай неадпаведнасці, далучальнага супастаўлення, далучальна-заключальныя, далучальна-прычынныя, далучальна-мэтавыя, далучальна-выясняльныя; *ускладнена-паратаксічны* – з сінтаксічнай сувяззю з'яднання, раз'яднання, далучальнай; *ускладнена-паўпрэдыкатыўны* – з паўпрэдыкатыўнай і далучальна-паўпрэдыкатыўнай сінтаксічнай сувяззю; *ускладнена-параўнальны* – з адсутнасцю скрытай прэдыкатыўнасці і наяўнасцю паралельных кампанентаў, з адсутнасцю скрытай прэдыкатыўнасці і паралельных кампанентаў, са скрытай прэдыкатыўнасцю і адсутнасцю паралельных кампанентаў; *ускладнена-далучальны* – з кампенсаторным кампанентам (адасобленым дапаўненнем), што ўказвае на аб'ект сумеснага дзеяння, на дадатковы аб'ект з адмоўным значэннем, які процiпастаўляецца становчаму аб'екту, што не адпавядае накіраванаму на яго дзеянню, абмяжоўвае сферу распаўсюджвання накіраванага на яго дзеяння; *ускладнена-інтрадуктыўны тып з устаўнымі канструкцыямі* – устаўныя канструкцыі, што ўказваюць на спосаб дзеяння, дубліруюць эліпсаваную лексему, змяшчаюць сінанiмічную ў адносінах да эліпсаванай лексему, са значэннем мімалётнай заўвагі; *ускладнена-інтрадуктыўны тып са звароткамі* – віды з указаннем і без указання на канкрэтную асобу. Структурна-сінтаксічныя асаблівасці кожнага віду дазволілі вылучыць падвіды, заснаваныя на разнастайных сінтаксічных сувязях і адносінах.

3. Семантычная тыпалогія канструкцый з эліпсісам дзеяслова, якая ўлічвае кампенсаторныя уласцівасці семантычных кампанентаў, з'яўляецца новай і ўключае 10 тыпаў: дынамічна-лакатыўны, экзістэнцыяльна-лакатыўны, акцыянальна-безаб'ектны, лакатыўна-пацыентыўны, акцыянальна-дэлібератыўны, акцыянальна-аб'ектны непераўтваральны, акцыянальна-аб'ектны пераўтваральны, статальны, экзістэнцыяльна-тэмпаральны, рэляцыйны. Кожны тып прадстаўлены адпаведнымі відамі, якія адлюстроўваюць усе магчымыя адценні семантыкі і сродкі яе рэалізацыі, фармалізаваныя ў адпаведныя мадэлі і схемы.

Частотнасць адлюстроўвае колькасць сінтаксічных адзінак у межах пэўнай мадэлі, а прадуктыўнасць указвае на здольнасць канкрэтнай мадэлі рэалізавацца ў пэўнай колькасці структурных схем. Сярэдняя прадуктыўнасць (або частата) мадэлі вылічваецца па формуле $p = \frac{100\%}{n}$, дзе $n$ – колькасць мадэлей унутры класа з агульнай семантыкай або колькасць структурных схем унутры пэўнай мадэлі. Яна прадстаўлена наступнай градацыйнай класіфікацыяй: дынамічна-лакатыўны тып (22 мадэлі), акцыянальна-аб'ектны пераўтваральны (17 мадэлей), акцыянальна-безаб'ектны (15 мадэлей), лакатыўна-пацыентыўны (9 мадэлей),

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

акцыянальна-аб'ектны нepaўтваральны (8 мадэлей), экзістэнцыяльна-лакатыўны (6 мадэлей), акцыянальна-дэліберагыўны (4 мадэлі), статальны (4 мадэлі), рэляцыйны (4 мадэлі), экзістэнцыяльна-тэмпаральны (3 мадэлі).

Кампенсаторнае поле кожнага тыпу ўключае сродкі рэалізацыі адпаведнай семантыкі (паказчыкі семантыкі), якія маюць канстантны або пераменны характар. Іх сістэматызацыя ажыццяўляецца на аснове тыпалагічных уласцівасцей – ад універсальных да ўнікальных. *Дынамічна-лакатыўны тып:* дырэктыў-старт; дырэктыў-фініш; транзітыў; фінітыў-1; фінітыў-4; дыменсіў-1; дыменсіў-3; медыятыў-1. *Экзістэнцыяльна-лакатыўны тып:* лакатыў. *Лакатыўна-пацыентыўны тып:* пацыенс; аб'ект; элімінатыў. *Акцыянальна-безаб'ектны тып:* фінітыў; спосаб; дэстыгнатыў; дыменсіў; лакатыў; каўзатыў; кандытыў; інструментыў; медыятыў. *Акцыянальна-дэліберагыўны тып:* дэліберат; атрыбутыўнае значэнне; спосаб; каўзатыў. *Акцыянальна-аб'ектны пераўтваральны тып:* пацыентыў; спосаб; аб'ектыў; крэатыў; бенефіцыенс; інструментыў (нерухомы); інструментыў (рухомы); локум; медыятыў. *Акцыянальна-аб'ектны непераўтваральны тып:* данатыў; аб'ектыў; спосаб; фінітыў-4; адрасат. *Экзістэнцыяльна-тэмпаральны тып:* дыстрыбутыў-2; тэмпаратыў. *Статальны тып:* локум. *Рэляцыйны тып:* рэлянт-2; медыятыў.

4. Спосабы выражэння прэдыкатыўных значэнняў і іх рознаўзроўневых моўных сродкаў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова ўпершыню сістэматызаваны з улікам наступных фактараў:

структурнымі фактарамі рэгулюецца кампенсаторная функцыя дэтэрмінаваных членаў сказа; адасобленых акалічнасцей, кампанентаў складанага сказа і складанага сінтаксічнага цэлага (пры маркіроўцы значэнняў тэмпаральнасці); звароткаў; парцэляваных і ўстаўных канструкцый (пры маркіроўцы значэнняў мадальнасці і персанальнасці);

структурна-сэнсавымі фактарамі абумоўлена кампенсаторная функцыя часціц і лексічных сродкаў пры маркіроўцы значэнняў тэмпаральнасці; маркіроўка значэнняў персанальнасці эксплікуецца лексічнымі сродкамі – асабовымі займеннікамі або ўласнымі ці агульнымі назоўнікамі;

фармальна-граматычнымі фактарамі рэгулюецца маркіроўка значэння тэмпаральнасці з дапамогай марфалагічных сродкаў: формаўтваральных часціц, якія ўказваюць на значэнне асобы, безасабова-прэдыкатыўных прыслоўяў, форм дапаўнення;

фактарам семантычнай імплікацыі абумоўлена маркіроўка значэнняў персанальнасці спосабам пераемнасці кампанентаў аб'ектна-суб'ектнага тыпу ў структуры складанага сказа або складанага сінтаксічнага цэлага;

з дапамогай сінтаксічнага паралелізму маркіруюцца значэнні тэмпаральнасці на аснове сінтаксічнай і граматычнай аднапланавасці

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

кампанентаў, што ахопліваюць паратаксічную сінтаксічную сувязь (аднародныя выказнікі і часткі складаных канструкцый). Сінтаксічны паралелізм выступае спосабам кампенсацыі значэння персанальнасці ў структуры складанага сказа або звышфразавага адзінства.

5. Кампенсаторная функцыя парадыгмы структурна-сінтаксічных мадыфікацый у эліптычных канструкцыях, выяўленая ўпершыню, абумоўлена канструкцыйна-трансфармацыйным, кантэкстуальна-катэгарыяльным, логіка-семантычным фактарамі, асноўным параметрам сістэматызацыі якіх выступае спосаб ідэнтыфікацыі семантыкі сінтаксемы.

Ідэнтыфікацыя семантычнай і сінтаксічнай функцый сінтаксемы ажыццяўляецца на аснове трансфармацыйнай парадыгмы (канструкцыйна-трансфармацыйны фактар) з улікам канстантнага характару сінтаксічных сувязей і адносін. Функцыянальны дыяпазон сінтаксемы ўключае ўсе магчымыя семантычныя функцыі і абумоўлены тыпам яе прэдыката. Да найбольш прадуктыўных адносяцца наступныя сінтаксемы: *назоўнік М. скл. (у + назоўнік)* (6) выконвае наступныя семантычныя функцыі: прэдыкат, фінітыў-2, лімітатыў, лакатыў, аб’ект, дэскрыптыў; *назоўнік Р. скл. (з + назоўнік)* (5) выконвае семантычныя функцыі: прэдыкат, фабрыкатыў, стымул, каўзатыў, лакатыў; *назоўнік Тв. скл. (з + назоўнік)* (4) выконвае семантычныя функцыі: прэдыкат намінalізаваны, прэдыкат кваліфікатыўны, аб’ект, дэскрыптыў; *назоўнік Н. скл.* (3) выконвае семантычныя функцыі: прэдыкат, экзісцыенс, статальная прыкмета; *назоўнік Тв. скл. (без прыназоўніка)* (3) выконвае наступныя семантычныя функцыі: прэдыкат, аб’ект, медыятыў. Нізкую ступень прадуктыўнасці маюць сінтаксемы: *назоўнік Р. скл. (для + назоўнік)* (2) выконвае семантычныя функцыі: прэдыкат, фінітыў-4; *назоўнік В. скл. (за + назоўнік)* (2) выконвае семантычныя функцыі: сітуант, прэдыкат; *назоўнік В. скл. (у + назоўнік)* (2) выконвае семантычныя функцыі: фінітыў, наміналізаваны прэдыкат; *назоўнік В. скл. (на + назоўнік)* (2) выконвае семантычныя функцыі: наміналізаваны прэдыкат, лакатыў; *прыметнік М. скл.* (2) выконвае семантычныя функцыі: прэдыкат, атрыбутыўнае азначэнне; *назоўнік Р. скл. (да + назоўнік)* (1) выконвае функцыю прэдыката; *назоўнік Р. скл. (без + назоўнік)* (1) выконвае функцыю прэдыката; *назоўнік Р. скл. (пад + назоўнік)* (1) выконвае функцыю дэстыгнатыва.

Кампенсаторныя ўласцівасці кантэкстуальна-катэгарыяльных фактараў поліфункцыянальнасці нязначныя. Ідэнтыфікацыя семантычнай і сінтаксічнай функцый сінтаксемы абумоўлена характарам сінтаксічных сувязей і адносін – канстантным (пры змене семантычнай функцыі і захаванні сінтаксічнай) або пераменным (пры змене семантычнай і сінтаксічнай функцый адначасова). Да найбольш прадуктыўных адносяцца наступныя сін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

таксемы: назоўнік Р. скл. адз. лік (да + назоўнік) (4); назоўнік Тв. скл. адз. лік (з + назоўнік) (4); інфінітыў (3). Н а й м е н ш п р а д у к т ы ў н ы м і з’яўляюцца сінтаксемы: назоўнік Р. скл. адз. лік (без + назоўнік) (2); назоўнік Р. скл. адз. лік (заместа + назоўнік) (2); назоўнік Тв. скл. адз. лік (назоўнік без прыназоўніка) (2); лічэбнік Н. скл. адз. лік (2); назоўнік Н. скл. адз. лік (2); дзеепрыметнік Н. скл. адз. лік (1).

Кампенсаторныя ўласцівасці л о г і к а - с е м а н т ы ч н ы х фактараў невысокія, функцыянальны дыяпазон сінтаксем абумоўлены імпліцытнай семантыкай і пераменным характарам сінтаксічных сувязей і адносін: *ф о р м а і н ф і н і т ы в а* (4); *і м е н н а я  с і н т а к с е м а* (3).

6. Выяўлены і ўпершыню сістэматызаваны механізмы рэгулявання кампенсаторнай функцыі кампанентаў: структурна-сэнсавыя, сэнсавыя, фармальныя, актуалізацыйныя, інтэрпрэтацыйныя. С т р у к т у р н а - с э н с а в ы я моўныя механізмы рэгулююць кампенсаторную функцыю прэдыкатыўных частак у структуры поліпрэдыкатыўнай сінтаксічнай адзінкі, кампанентаў ускладненых сінтаксічных адзінак на аснове разгортвання, пашырэння іх сінтаксічных пазіцый. С э н с а в ы я моўныя механізмы забяспечваюць замяшчэнне эліпсаванага кампанента функцыянальна тоесным у структуры звышфразавага адзінства і на аснове інтрадуктыўнай сінтаксічнай сувязі. Ф а р - м а л ь н ы я моўныя механізмы рэгулююць структурызацыю семантычных тыпаў эліптычных канструкцый у адпаведныя мадэлі і схемы. А к т у а л і - з а ц ы я абумоўлівае экспліікацыю прэдыкатыўных значэнняў сродкамі сінтаксічнага, марфалагічнага, лексічнага, фанетычнага ўзроўняў, спосабам імплікацыі і пераемнасці кампанентаў. І н т э р п р э т а ц ы я рэгулюе фактары ідэнтыфікацыі семантычнай і сінтаксічнай функцыі сінтаксемы ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з’яўляецца цалкам самастойнай работай, у якой распрацаваны тэарэтычныя асновы сінхроннага тыпалагічнага апісання сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы, вывучаны і апісаны ўстаноўленыя тыпы канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Упершыню ў якасці тыпалагізацыйнага параметра выкарыстана кампенсаторная прыкмета, што ўласціва канструкцыям з эліпсісам дзеяслова і ў поўнай меры выяўляе заканамернасці іх функцыянавання.

**Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць** дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што ўпершыню распрацаваны і выкарыстаны тэарэтычныя асновы кампенсаторнай сінтаксічнай тыпалогіі, выяўлены класіфікацыйныя, кваліфікацыйныя параметры для аналізу і сістэматызацыі ўсіх тыпаў канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Такім чынам, у дысертацыйным даследаванні:

1) распрацавана канцэпцыя сінхроннага тыпалагічнага вывучэння канструкцый з эліпсісам дзеяслова з пазіцыі кампенсаторнай прыкметы;

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

2) прадстаўлены новыя параметры тыпалагізацыі канструкцый з эліпсісам дзеяслова, якія дазволілі вызначыць спецыфіку структурнай, семантычнай і граматычнай арганізацыі сінтаксічных адзінак, што паглыбляе тэорыю функцыянальнага сінтаксісу, стварае тэарэтычную базу для аналізу іншых сінтаксічных з'яў – сінтаксічных сінанімічных пераўтварэнняў, сінтаксічнай рэдукцыі, сінтаксічнай кампрэсіі, парцэляцыі;

3) пабудавана шматузроўневая мадэль даследавання сінтаксічных з'яў, якая дазваляе на аснове вылучаных крытэрыяў апісаць разнастайныя аб'екты сінтаксісу, вызначыць спецыфіку іх структурнай і семантычнай арганізацыі, асаблівасці функцыянавання і адпаведным чынам сістэматызаваць іх;

4) створана класіфікацыя тыпаў, відаў і падвідаў канструкцый з эліпсісам дзеяслова, кампенсаторныя сродкі сістэматызаваны ў кантынуум у адпаведнасці са ступенню праяўлення тыпалагічных уласцівасцей і іх характарам – канстантным або пераменным;

5) уведзены ў навуковы ўжытак і на практыцы апрабаваны новыя крытэрыі апісання значнага фрагмента сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы, якія могуць быць выкарыстаны пры даследаванні іншых сінтаксічных з'яў.

**Метады даследавання**

У залежнасці ад канкрэтных задач, што вырашаліся на розных этапах даследавання, выкарыстоўваліся адпаведныя метады: *апісальны метад* дазволіў падзяліць сістэму аб'ектаў на аснове структурнага, семантычнага або функцыянальнага падабенства і раскласіфікаваць іх у адпаведнасці з тыпалагізацыйнай прыкметай; *метад кампанентнага аналізу* даў магчымасць выявіць семантыку кампенсаторных кампанентаў; *трансфармацыйны метад* дазволіў вызначыць сінанімічныя сінтаксічныя пераўтварэнні; з дапамогай *метаду сінтаксічнага мадэліравання* сінтаксічны аб'ект быў фармалізаваны ў семантычныя мадэлі і структурныя схемы; *дыстрыбутыўны метад* даў магчымасць выявіць семантыка-сінтаксічныя адносіны адзінак на ўзроўні звышфразавага адзінства; *методыкі колькасных падлікаў* дазволілі ўстанавіць адносную частотнасць і прадуктыўнасць мадэлей і структурных схем. У дысертацыйным даследаванні шырока выкарыстоўваліся *нелінейныя метады* (табліцы, схемы, дыяграмы), што абумоўлена агульнай канцэпцыяй даследавання, значнай колькасцю фактычнага матэрыялу, паэтапным прыцягненнем колькасных паказчыкаў, неабходнасцю мадэліравання і схематызацыі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыйнага даследавання**

Асноўныя вынікі і тэарэтычныя палажэнні дысертацыі былі абмеркаваны і атрымалі станоўчую ацэнку на наступных міжнародных канферэнцыях: «Пісьменнік – мова – стыль» (Мінск, 1996), «Языковая номинация» (Мінск, 1996), «От слова к тексту» (Мінск, 2000), «Беларуская мова і мовазнаўства на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рубяжы III тысячагоддзя: да 70-годдзя Ін-та мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі» (Мінск, 2000), «Текст в лингвистической теории и в методике преподавания филологических дисциплин» (Мазыр, 2001), «Культура мовы і грамадства» (Мінск, 2002), «Актуальныя пытанні беларускай лінгвістыкі (да 80-годдзя прафесара М.С. Яўневіча)» (Мінск, 2002), «Коммуникативные стратегии» (Мінск, 2003), «Культура речи в условиях билингвизма: состояние, перспективы, инновационные технологии» (Мінск, 2004), «Мова – Літаратура – Культура: да 80-годдзя праф. Л.М. Шакуна» (Мінск, 2006), «Шостыя Танкаўскія чытанні: да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа і 95-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка» (Мінск, 2008), «Сёмыя Танкаўскія чытанні: да 95-годдзя Бел. дзярж. пед. ун-та імя Максіма Танка» (Мінск, 2010), «Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння» (Мінск, 2010, 2011, 2013), «Язык и межкультурные коммуникации» (Мінск – Вільнюс, 2011).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыйнага даследавання**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання прадстаўлены ў наступных публікацыях: 1 манаграфія (24 аўт. аркушы); 23 навуковыя артыкулы – у рэцэнзаваных навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь, у тым ліку 4 у замежных (18 аўт. аркушаў); 10 – у зборніках навуковых прац (8 аўт. аркушаў); 15 – у зборніках матэрыялаў і тэзісаў міжнародных навуковых канферэнцый, у тым ліку ў замежных (4 аўт. аркушы); 1 граматыка беларускай мовы (раздзел). Агульны аб'ём публікацый складае 54 аўтарскія аркушы. Усе публікацыі выкананы саіскальнікам без сааўтараў.

**Структура і аб'ём дысертацыйнага даследавання**

Дысертацыя змяшчае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, чатыры главы, заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры (377 пазіцый), спіс публікацый саіскальніка (50 пазіцый), спіс крыніц даследавання (620 пазіцый), 5 дадаткаў, 84 рысункі, 1 схему. Асноўны тэкст дысертацыі займае 220,5 старонкі, бібліяграфічны спіс – 65 старонак, дадаткі – 176 старонак, рысункі і схема – 30 старонак. Агульны аб'ём даследавання – 492 старонкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ